**Абагульнім і запомнім.** Эканоміка Беларусі мае галіновую і тэрытарыяльную структуру. ВУП рэспублікі складае 105,2 млрд руб., ВУП на душу насельніцтва — каля 6 тыс. дол. ЗША. Гаспадарка Беларусі падзяляецца на вытворчую сферу і сферу паслуг, доля якіх у ВУП краіны прыкладна роўная. Размяшчэнне галін гаспадаркі залежыць ад памераў тэрыторыі, прыродна-рэсурснага патэнцыялу, эканоміка-геаграфічнага становішча, працоўных рэсурсаў, спажывецкага, экалагічнага, транспартнага, інфармацыйнага і іншых фактараў.

1. Як змяняецца ВУП краіны на сучасным этапе развіцця эканомікі? 2. На якія сферы падзяляецца эканоміка Беларусі? 3. Якія ўмовы і фактары ўплываюць на размяшчэнне вытворчасці ў Беларусі? 4. Які цэнтр прамысловай вытворчасці адносіцца да буйнейшых па аб'ёмах вытворчасці?

5. Чаму апошнім часам віды эканамічнай дзейнасці замяняюць традыцыйныя галіны вытворчасці? 6. Чаму эканоміку Беларусі называюць сацыяльна-арыентаванай рыначнай? 7. Пералічыце па пяць відаў прамысловай прадукцыі, вытворчасць якіх залежыць у асноўным ад сыравіннага і паліўна-энергетычнага фактараў. 8 Растлумачце, якія галіны гаспадаркі і чаму арыентуюцца на спажыўца. 9. Якія галіны развіваюцца ў адпаведнасці з прыроднымі і экалагічнымі ўмовамі?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Карыстаючыся данымі атласа і рэсурсамі сеткі Інтэрнэт, падрыхтуйце паведамленне пра структуру ВРП вашай вобласці.

## § 27. Геаграфія сельскай гаспадаркі. Геаграфія раслінаводства

***Узгадваем.*** *На якія падгаліны падзяляецца сельская гаспадарка? У чым асаблівасці аграклiматычных рэсурсаў Беларусі?*

**Роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы краіны.** Асноўная задача сельскай гаспадаркі — задавальненне попыту насельніцтва на прадукты харчавання, а таксама забеспячэнне прадпрыемстваў харчовай і лёгкай прамысловасці сыравінай. Сельскагаспадарчая вытворчасць з'яўляецца асноўным відам занятасці ў сельскай мясцовасці. На долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі ў Беларусі цяпер прыходзіцца 7,8 % ВУП, у ёй занята амаль 10 % працаздольнага насельніцтва. Спецыялізуецца сельская гаспадарка на вытворчасці малака і мяса, збожжавых культур, бульбы, цукровых буракоў і лёну. Беларусь амаль цалкам забяспечвае сябе харчаваннем: імпарт складае менш за 10 % усяго аб'ёму спажывання.

Сельская гаспадарка падзяляецца на раслінаводства і жывёлагадоўлю. У вартасным выражэнні вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 2017 г. доля жывёлагадоўлі складае 52 %, а раслінаводства — 48 %.

У *жывёлагадоўлі* найбольш распаўсюджана развядзенне буйной рагатай жывёлы, свінагадоўля і птушкагадоўля.

*Раслінаводства* мае шматгаліновую структуру і займаецца вырошчваннем збожжавых, тэхнічных і кармавых культур, бульбы, пладоў і гародніны. У параўнанні з 2010 г. аб'ёмы вытворчасці прадукцыі раслінаводства выраслі на 20 %, а жывёлагадоўлі — на 10 %.

Асноўная роля ў структуры сельскай гаспадаркі належыць сельскагаспадарчым арганізацыям, на долю якіх прыпадае амаль 80 % вытворчасці прадукцыі. Да іх адносяцца агракамбінаты, сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы, камунальныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і інш. У апошнія гады ў краіне ствараюцца агрaхолдынгі, якія ўключаюць вытворчасць, перапрацоўку і рэалізацыю сельгаспрадукцыі. У Беларусі ажыццяўляюць дзейнасць больш за 40 агрaхолдынгаў, буйнейшымі з іх з'яўляюцца «Ждановічы» (Мінскі раён), «Сервалюкс-Агра» (Смалявіцкі і Магілёўскі раёны), «Дзяржынскі» (Дзяржынскі раён), «Сноў» (Нясвіжскі раён), «Пухавіцкі аграпрадукт» (Пухавіцкі раён), «Скідзельскі» (Гродзенскі раён).

У цяперашні час назіраецца ўстойлівы рост колькасці сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і іх удзельнай вагі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. На пачатак 2018 г. у краіне зарэгістравана 2652 фермерскія гаспадаркі, якія вырабляюць каля 2 % сельскагаспадарчай прадукцыі.

Удзельная вага асабістых падсобных гаспадарак насельніцтва ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў 2018 г. — менш за 19 %, хаця яшчэ ў пачатку 2000-х гг. на іх прыходзілася каля 45 % аб'ёмаў вытворчасці. Пры гэтым сярод такіх гаспадарак вялікая доля гараджан, якія маюць дачныя ўчасткі або загарадныя домікі.

**Структура і размяшчэнне зямельных угоддзяў.** Плошча сельскагаспадарчых зямель у Беларусі складае 8,5 млн га (41 % усяго зямельнага фонду краіны). У залежнасці ад прыродных умоў, асвоенасці тэрыторыі і іншых фактараў фарміруецца *структура сельскагаспадарчых угоддзяў*. Яна можа мець значныя адрозненні па абласцях і раёнах Беларусі. У цэлым па краіне пераважаюць *ворныя землі*, на долю якіх прыходзіцца 67 % плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў. Лугавыя землі і пашы займаюць 31 % сельскагаспадарчых угоддзяў, пастаянныя культуры — 2 %. Змяненне

плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў не прыводзіць да істотнага змянення структуры іх выкарыстання.

Прааналізуйце карты атласа (с. 44). Для якіх раёнаў Беларусі характэрная найбольшая ўдзельная вага сельскагаспадарчых угоддзяў? Ворных зямель? Чаму?

**Геаграфія раслінаводства.** У раслінаводстве Беларусі найбольшае значэнне мае *збожжавая гаспадарка*. Ад колькасці і якасці збожжа залежыць не толькі забеспячэнне насельніцтва харчовымі хлебнымі прадуктамі, але і вытворчасць канцэнтраваных кармоў для жывёлагадоўлі.

Збожжавыя культуры вырошчваюцца ва ўсіх раёнах Беларусі. Яны займаюць каля 40 % ворных зямель, а ў цэнтральных і заходніх раёнах доля збожжавых вышэйшая. *Ад чаго залежыць змяненне долі пасеву збожжавых культур па краіне?* Плошча пасеваў азімых на 20 % большая за плошчу пасеваў яравых збожжавых культур. Сярод збожжавых культур найбольш распаўсюджаная азімая і яравая пшаніца (каля 30 %) (мал. 109).

1. Пшаніца — патрабавальная да цяпла, вільгаці, урадлівасці глебы





2. Жыта — лёгка пераносіць неспрыяльнае надвор'е, нізкую ўрадлівасць глебы і яе кіслотнасць

3. Ячмень — патрабавальны да высокай урадлівасці глебы



4. Авёс — патрабавальны да вільготнасці і прахалоднага надвор'я, высейваецца раней за іншыя яравыя збожжавыя культуры



5. Кукуруза — патрабавальная да асветленасці, цяпла, урадлівасці глебы



6. Грэчка — патрабавальная да цяпла і вільгаці



| пасяўныя плошчы, тыс. га | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 2010 | 611 | 352 | 691 | 184 | 113 | 31 |
| 2015 | 737 | 252 | 507 | 154 | 53 | 14 |
| 2017 | 721 | 258 | 455 | 162 | 134 | 17 |

| валавы збор, тыс. т | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 2010 | 1739 | 735 | 1966 | 442 | 551 | 18 |
| 2015 | 2896 | 753 | 1849 | 492 | 223 | 12 |
| 2017 | 2620 | 670 | 1420 | 460 | 694 | 18 |

Мал. 109. Збожжавыя культуры, якія вырошчваюцца на тэрыторыі Беларусі

Значныя пасевы трыцікале (20 %), ячменю (19 %) і жыта (11 %). На долю пшаніцы, трыцікале і ячменю прыходзіцца каля 70 % валавога збору збожжавых.

Самая каштоўная харчовая культура — пшаніца (мал. 109). Па плошчы пасеваў нязначна пераважае яравая пшаніца. Найбольшыя плошчы пасеваў пшаніцы характэрныя для Гродзенскай, Мінскай і Брэсцкай абласцей.

У апошнія гады павялічыліся пасевы трыцікале, або пшанічна-жытніх гібрыдаў. Трыцікале валодае павышанай марозаўстойлівасцю, устойлівасцю супраць грыбковых і вірусных хвароб, паніжанай патрабавальнасцю да ўрадлівасці глебы. Выкарыстоўваецца як харчовая і фуражная культура. Пасяўныя плошчы павялічыліся з 444 тыс. га ў 2010 г. да 493 тыс. га ў 2017 г. Чаму трыцікале з'яўляецца перспектыўнай культурай?

*Жыта* — найбольш устойлівая да прыродных умоў Беларусі культура. Асноўныя яе пасевы на поўдні краіны. Па валавым зборы жыта (у вартасных адносінах) Беларусь знаходзіцца на 5-м месцы ў свеце. *Ячмень* — адна з самых высокаўраджайных і скараспелых культур, мае выдатныя кармавыя якасці. Найбольшыя плошчы ячмень займае ў цэнтральнай і заходняй Беларусі. *Авёс* вырошчваецца паўсюдна, але канцэнтрацыя пасеваў большая на поўначы краіны. На поўдні Беларусі пашырыліся пасевы *кукурузы* на зерне. На паўднёвым усходзе Беларусі традыцыйнай культурай доўгі час была *грэчка*. Яшчэ ў пачатку XX ст. па плошчы пасеваў яна саступала толькі жыту. Але пасевы грэчкі скарачаюцца з-за моцнага назапашвання ў яе зерні радыенуклідаў і невялікага павелічэння ўраджайнасці (мал. 109).

***Бульбаводства*** — адна з падгалін спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі (мал. 110). Лёгкія па гранулametрычным складзе глебы, аптымальны цеплавы і водны рэжым тэрыторыі, шырокае выкарыстанне бульбы ў якасці прадукту харчавання і корму для свіней спрыялі яе шырокаму

<table>
<tr><td colspan="3">Бульба — універсальная культура, якая выкарыстоўваецца</td><td rowspan="5"></td><td>2010</td><td>2015</td><td>2017</td></tr>
<tr><td rowspan="4">у харчаванні людзей (1/4 ураджаю)</td><td rowspan="4">у кармленні жывёл (1/3 ураджаю)</td><td rowspan="4">як сыравіна для прамысловасці (1/3 ураджаю)</td><td colspan="3">пасяўныя плошчы, тыс. га</td></tr>
<tr><td>371</td><td>314</td><td>277</td></tr>
<tr><td colspan="3">валавы збор, тыс. т</td></tr>
<tr><td>7831</td><td>5995</td><td>6415</td></tr>
</table>

Мал. 110. Выкарыстанне і вырошчванне бульбы

распаўсюджанню ў краіне. *Дзе знаходзіцца цэнтр паходжання бульбы?* Пасевы бульбы канцэнтруюцца на ўсходзе Гродзенскай, поўдні Мінскай і паўночным усходзе Брэсцкай абласцей. Па зборы бульбы ў разліку на аднаго жыхара Беларусь займае адно з першых месцаў у свеце (каля 700 кг). Краіна штогод дае 3–4 % сусветнага збору гэтай культуры, цалкам забяспечвае свае патрэбы ў харчовай бульбе, значную яе колькасць экспартуе.

***Агародніцтва*** развіваецца пераважна ў прыгарадных зонах Мінска і абласных цэнтраў, а таксама ў раёнах размяшчэння буйных агароднінаперапрацоўчых прадпрыемстваў (Быхаўскім, Ельскім, Жыткавіцкім, Іванаўскім, Маларыцкім і інш.). Буйныя прадпрыемствы па вырошчванні гародніны — агракамбінат «Ждановічы», Мінская агароднінная фабрыка і Мінскі парнікова-цяплічны камбінат.

Асаблівасцю вырошчвання бульбы і гародніны з’яўляецца тое, што асноўныя іх зборы прыходзяцца на асабістыя падсобныя і фермерскія гаспадаркі. Буйны вытворца бульбы, напрыклад, фермерская гаспадарка «Цнянскія экапрадукты».

***Садоўніцтва.*** Найбольш спрыяльныя для садоўніцтва ўмовы маюцца ў паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельскай вобласці. Самыя буйныя масівы садоў размешчаны ў гаспадарках і кампаніях Брэсцкай («Расвет»), Мінскай («Зубкі») і Магілёўскай («Дусен») абласцей. Дастаткова новы від бізнесу для Беларусі — прамысловае вырошчванне ягад (буякоў, клубніц), кавуноў, грыбоў. Пакуль Беларусь не ў стане цалкам забяспечыць сябе пладамі, якія вырошчваюцца ва ўмераных шыротах, таму частка іх завозіцца з Малдовы, Польшчы, Украіны. *Якія садовыя культуры вырошчваюцца ў краіне?*

***Тэхнічныя культуры*** ў Беларусі, у параўнанні са збожжавымі, займаюць невялікія плошчы, аднак іх пасевы ў апошнія гады павялічваюцца. Вырошчваецца ўсяго некалькі культур, сярод якіх найбольш традыцыйная — *лён-даўгунец* (мал. 111). У краіне засяроджана каля 20 % сусветных пасеваў ільну. Беларусь займае 3-е месца ў свеце па вытворчасці льновалакна. Найбольшая канцэнтрацыя лёну ў Віцебскай вобласці, на поўначы Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, у якіх ільнаводства з’яўляецца галіной спецыялізацыі. *Які ўплыў на вырошчванне лёну ў Беларусі аказваюць змены клімату?*

Важнае значэнне ў Беларусі маюць *цукровыя буракі*. Іх пасевы сканцэнтраваны ў асноўным у Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцях.

Глебава-кліматычныя ўмовы краіны не самыя спрыяльныя для вырошчвання цукровых буракоў. Выхад цукру ў разліку на 1 га пасеваў у два разы меншы, чым ва Украіне. Сабекошт атрыманага цукру ў Беларусі вышэйшы. Чаму неабходна вырошчваць у Беларусі буракі для вытворчасці цукру?

Лён-даўгунец — спрыяльны прахалоднае і вільготнае лета з вялікай колькасцю пахмурных дзён, суглінкавыя і супясчаныя глебы



Цукровыя буракі — патрабуюць шмат сонечнай энергіі, вільгаці, урадлівых глеб



Рапс — патрабавальны да вільгаці і ўрадлівасці глебы, холадаўстойлівая культура



| пасяўныя плошчы, тыс. га | | | |
|---|---|---|---|
| | 2010 | 2015 | 2017 |
| Лён-даўгунец | 62 | 45 | 47 |
| Цукровыя буракі | 97 | 103 | 101 |
| Рапс | 326 | 259 | 339 |

| валавы збор, тыс. т | | | |
|---|---|---|---|
| | 2010 | 2015 | 2017 |
| Лён-даўгунец | 46 | 41 | 42 |
| Цукровыя буракі | 3773 | 3300 | 4989 |
| Рапс | 375 | 382 | 602 |

Мал. 111. Тэхнічныя культуры, якія вырошчваюцца на тэрыторыі Беларусі

Адной з галоўных тэхнічных культур у Беларусі ў апошнія гады стаў *рапс*, з насення якога атрымліваюць алей. Найбольшую долю ў пасевах тэхнічных культур рапс займае ў Гомельскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях (75–90 %), а па плошчы яго пасеваў вылучаюцца Мінская і Віцебская вобласці (мал. 111).

**Вырошчванне кармавых культур.** У краіне доля кармавых культур у палявым севазвароце пастаянна павялічваецца. У Віцебскай і Магілёўскай абласцях кармавыя культуры займаюць 40 % пасеваў. У Віцебскай вобласці пераважае чырвоная і ружовая канюшына. На Палессі распаўсюджаны лубін і цімафееўка, на паўночным захадзе, захадзе і поўдні — пасевы кукурузы на сілас.

**Абагульнім і запомнім.** У структуры сельскагаспадарчых зямель пераважаюць ворныя — 67 %. Самыя распаўсюджаныя збожжавыя культуры — пшаніца, трыцікале, ячмень і жыта. Важнымі тэхнічнымі культурамі з'яўляюцца лён-даўгунец, цукровыя буракі і рапс. Бульбаводства — падгаліна спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі.

1. Якую ролю адыгрывае сельская гаспадарка ў эканоміцы краіны? 2. Якія збожжавыя культуры вырошчваюць у краіне? 3. Якія ўмовы спрыяюць развіццю бульбаводства і льнаводства?

4. Чым можна растлумачыць перавагу збожжавых культур у структуры пасяўных плошчаў? 5. Чаму ў Беларусі ў цяперашні час адной з галоўных тэхнічных культур з'яўляецца рапс? 6. Чаму агародніцтва канцэнтруецца ў асноўным у прыгарадной зоне буйных гарадоў?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Складзіце схему «Раслінаводства Беларусі», на якой адлюструйце структуру галіны, а таксама пакажыце залежнасць вырошчвання сельскагаспадарчых культур ад глебава-кліматычных умоў. 2. Распрацуйце буклет «Гародніна і садавіна Беларусі».

## § 28. Геаграфія жывёлагадоўлі

***Узгадваем.*** *Ці залежыць развіццё жывёлагадоўлі ад прыродных умоў?*

**Асаблівасці развіцця жывёлагадоўлі.** Жывёлагадоўля дае самыя высокакаларыйныя прадукты харчавання (мяса, малако, яйкі), пастаўляе воўну, шчаціннe, шкуры, футра для лёгкай прамысловасці і развіваецца ў цеснай узаемасувязі з раслінаводствам. Прыроднай асновай для развіцця жывёлагадоўлі з'яўляюцца натуральныя лугі. Іх удзельная вага ў плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў па краіне складае больш за 30 %. У межах Палесся доля натуральных сенажацей і пашы больш высокая, што спрые развядзенню буйной рагатай жывёлы і авечкагадоўлі. Кармавую базу складаюць таксама кармавыя культуры на ворыве, камбікормы, адходы харчовай прамысловасці. Больш развітая жывёлагадоўля ў Гродзенскай, Брэсцкай абласцях і на захадзе Мінскай вобласці.

Вытворчасць малака на душу насельніцтва ў краіне перавысіла 770 кг. Доля Беларусі ў сусветнай вытворчасці малака складае каля 1 %, мяса — 0,4 %. Беларусь уваходзіць у 15 краін — буйнейшых сусветных экспарцёраў малочнай прадукцыі і 25 краін — лідараў па экспарце мяса.

**Жывёлагадоўля.** Гадоўля буйной рагатай жывёлы забяспечвае насельніцтва малочнай і мясной прадукцыяй. Ялавічына належыць да каштоўных і запатрабаваных відаў мясной прадукцыі, таму развядзеннем буйной рагатай жывёлы займаюцца паўсюдна. Яго пагалоўе складае 4,36 млн галоў (табл. 4). Найбольшая шчыльнасць буйной рагатай жывёлы ў Гродзенскай, Брэсцкай і часткова Мінскай абласцях. Разводзяць жывёлу малочнага і малочна-мяснога напрамку (мал. 112).



Мал. 112. Племзавод